# ПРАБЛЕМА РАЗВІЦЦЯ АНТЫЎТОПІІ Ў ЧЭШСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**В. С. Матрунчык**

У XX стагоддзі жанр антыўтопіі становіцца адным з самых актуальных. Антыўтапічныя творы часам аказваліся настолькі пераканальнымі ў паказе магчымых шляхоў развіцця чалавецтва, што значна ўплывалі на грамадскую думку, а праз яе – і на палітычныя абставіны ў свеце. Такі лёс напаткаў, напрыклад, вядомую антыўтопію Дж. Оруэла ***«1984»***. Антыўтапічнымі матывамі прасякнуты творы многіх вядомых аўтараў навуковай фантастыкі: А. Азімава, К. Вонегута, Р. Брэдберы, Э. Бёрджэса і інш. Самыя знакамітыя антыўтопіі, аднак, былі напісаныя па-за межамі навукова-фантастычнага жанру (*«Мы»* Я. Замяціна, *«Гэты новы цудоўны свет»* О. Хакслі, *«1984»* Дж. Оруэла). Не мінула антыўтопія і чэшскую літаратуру, прычым адлік існавання гэтага жанру ў ёй можна пачынаць яшчэ з 17 стагоддзя.

Праз сто гадоў пасля «Ўтопіі» Т. Мора і адначасова з «Горадам сонца» Т. Кампанелы з’яўляецца *«Лабірынт света і рай сэрца»* (1623) **Яна Амаса Коменскага** (1592 – 1670). Тэма, да якой звярнуўся ў сваім творы вялікі педагог і філосаф, адвечная праблема сэнсу жыцця, прадугледжвала і звычайную для XVII ст. форму казання ці трактата, але Коменскі выкарыстоўвае такія эпічныя сродкі, якія збліжаюць ягоную ўтопію са свецкай белетрыстыкай. Утопіяй гэты твор называюць абсалютна ўмоўна, бо Коменскі паказвае не ідэальную мадель света, як гэта рабілі ўтапісты да яго і пасля яго, а сучасны пісьменніку свет, толькі адлюстраваны алегарычна, у выглядзе фантастычнага горада. Вандроўнік даследуе гэты горад і бачыць пры гэтым толькі чалавечыя пакуты, выкліканыя чалавечымі ж заганамі і абсурднымі грамадскімі законамі. Законы звычайнай логікі аказваюцца парушанымі, што дазваляе зрабіць крытыку больш вострай, засяродзіць увагу чытача на асобных момантах. Менавіта таму «Лабірынт свету...» з яго галерэяй карыкатурна-гратэскавых вобразаў заклаў традыцыю сацыяльна-крытычнай, антыўтапічнай фантастыкі, якая натхняла не адно наступнае пакаленне пісьменнікаў і філосафаў. Вобраз Вандроўніка, які нястомна шукае праўду ў часы грамадскага разладу, не аднойчы будзе з’яўляцца ў пазнейшай навукова-фантастычнай літаратуры.

З часоў «Лабірынта свету і рая сэрца» на працягу амаль трох стагоддзяў літаратура Чэхіі развіваецца ва ўмовах нацыянальнага прыгнёту. Пачатак новай эпохі чэшскай фантастыкі звязаны з творчасцю **Карэла Чапэка і Яна Вайса**. Прычым абодва гэтыя аўтары

выкарыстоўваюць у сваёй творчасці элементы антыўтопіі. Абапіраюцца яны пры гэтым як на ўласна чэшскую літаратурную спадчыну, так і на лепшыя дасягненні замежнай літаратуры, асабліва гэта тычыцца творчасці Э. По і Г. Уэлса.

Пасля паспяховага дэбюту ў 1927 годзе Ян Вайс стварыў свой самы значны твор – раман ***«Дом у тысячу паверхаў»*** (1929). Кніга Вайса – «своеасаблівы сплаў фантастыкі казачна-рамантычнай, лірычнай і пры гэтым востра сацыяльнай» [1, с. 7]. Вайс сапраўды стварае цэлы свет, які можна разглядаць і праз прызму антыўтопіі. Агромністы небаскроб становіцца цэнтрам сусветнага Зла, у ім пануе несправядлівасць, прыніжэнне слабейшых, усеагульны падман, а ўладарыць грошы ў асобе пачварнага гаспадара Мулердома – Агісфера Мулера. Супрацьстаіць жа Злу як раз герой-вандроўнік (дэтэктыў Петр Брок), які даследуе свет Мулердома і пры гэтым, як і герой Коменскага, жахаецца таго, што бачыць у ім. Бясконцае будаўніцтва, у ахвяру якому кладуцца тысячы і тысячы жыццяў, трыццаціпяцігадовыя старыя, якія пазбаўлены магчымасці мець дзяцей, радавацца жыццю, таму што іх пастаянна атручваюць спецыяльнымі пілюлямі, і, з другога боку, казачна багатыя касты, для якіх пастаянна выдумляюцца ўсё новыя і новыя спосабы атрымоўваць асалоду, таму што звычайныя радасці жыцця іх ужо не задавальняюць. Небаскроб падобны на пачварную істоту, якую неабходна знішчыць. Брок дасягае гэтай мэты: ён забівае Мулера і тым самым разбурае Мулердом. Асаблівасцю антыўтопіі Яна Вайса з'яўляецца выкарыстанне казачных элементаў і паэтыкі снабачання (усе падзеі рамана – толькі сон героя).

Знакамітасць у цэлым свеце прынеслі К. Чапэку яго п'есы і раманы перасцярогі (мяжа паміж антыўтопіяй і раманам пересцярогі вельмі нязначная, і часам бывае цяжка дакладна вызначыць, да якога жанра належыць твор). Раман «**Кракатыт**» (1924) і драма «**Р. У. Р.**» (1920) перасцерагаюць чытача перад сіламі, якія чалавек можа абудзіць, але наўрад ці можа ўтаймаваць у свеце, дзе законам з'яўляецца асабістая выгада і ўладарыць грошы. Фантастычнае вынаходніцтва робатаў дапамагае Чапэку паказаць антыгуманнае аблічча свету, уладарамі якога з'яўляюцца сквапныя і бяздушныя прадпрымальнікі. Вынаходніцтва машын, падобных да людзей, якое магло б быць для апошніх благаславеннем, паварочваецца супраць чалавека. Кракатыт, які мог бы аблегчыць працу, становіцца смяротнай зброяй у руках карыслівых людзей. Перасцярогай супраць мацнеючага фашызму з'яўлялася п'еса «**Белая хвароба**» (1937). Раман «**Вайна з саламандрамі**» (1936) даследчыкі жанра антыўтопіі згадваюць найчасцей. Чапэк ужывае матыў,

ужо знаёмы сусветнай літаратуры, – магчымасць развіцця іншага віду жывёлы да інтэлектуальнага ўзроўню чалавека. З дапамогай сатыры, гратэску і алегорыі Чапэк паказвае самыя распаўсюджаныя і таму самыя жудасныя чалавечыя заганы і перасцерагае супраць таго, да чаго чалавек можа прыйсці ў выніку безадказнасці перад сабой і перад светам. Такім чынам, Карэл Чапэк у сваіх антыўтапічных творах мэтай сваёй сатыры абірае не «дрэнны» сацыяльны лад, як гэта звычайна бывае ў класічнай антыўтопіі, а прыватныя чалавечыя заганы.

Падчас панавання сацрэалізму ў чэшскай літаратуры не знайшлося месца для антыўтопіі: песімізм аўтараў антыўтопій савецкай крытыкай адназначна асуджаўся. Затое чэшская фантастыка сучаснага перыяду (пачынаючы ад 80-ых гадоў) прасякнута антыўтапічнымі матывамі. Гэта можна ўбачыць у многіх творах буйнейшага сучаснага чэшскага пісьменніка-фантаста і тэарэтыка фантастыкі *Ондржэя Нэфа.* Гэта тычыцца, напрыклад, яго рамана «***Сутнасць пудзеля»*** (1984) і трылогіі «***Міленіум»*** (1992, 1994, 1995).

Бліжэй за ўсіх да жанра антыўтопіі ў сваёй творчасці падышоў *Ёзаф Пецыноўскі.* Асабліва яскрава гэта праявілася ў яго рамане «**Соты з ядам»** (1992). У ім апавядаецца пра свет, падзелены на гіганцкія заводы, ізаляваныя адзін ад аднаго. Заводы называюцца сотамі і кіруюцца камп'ютэрам і элітнай кастай «выбраных». У сотах з незлічонай колькасцю паверхаў працуюць мільярды «рабочых» і «трутняў», генетычна змененых для кожнага з відаў працы. Гэта, дарэчы, збліжае твор Пецыноўскага з раманам Олдаса Хакслі «Гэты новы цудоўны свет», дзе кожны эмбрыён павінен быў прайсці належную апрацоўку хімікатамі, каб потым адрозніваецца ад членаў іншых каст не толькі функцыямі, але і фізічнымі дадзенымі. Адзіная сіла, якая дзейнічае ў «сотах з ядам», – ідэнтыфікацыйная карта карнэт. Карнэт з'яўляецца носьбітам усёй інформацыі пра свайго ўладальніка і адрозніваецца колерам, які у кожнай касты (трутні, дактары, «выбраныя», рабочыя) свой. З антыўтопіяй раман збліжае атмасфера татальнага страху, строгая іерархія грамадства і кантроль над жыццём кожнай асобы.

Сучасныя чэшскія аўтары часта змяшчаюць свой антыўтапічны свет на іншыя планеты, што дазваляе ім свабодна мадэляваць самыя розныя грамадскія сістэмы. Зразумела, што свет далёкай планеты – гэта толькі маскіроўка для свету зямнога. Такую алегорыю мы можам убачыць у рамане Івана Кмінэка ***«Ўтопія, найлепшая з версій»*** (1985). У гэтым творы выкарыстоўваецца яшчэ адзін вельмі папулярны матыў сучаснай фантастыкі: усім жыццём чалавека кіруе камп'ютэрны розум, штучны інтэлект. У рамане распавядаецца пра эксперымент над замкнёнай

групай людзей, мэтай якога з'яўляецца пабудова абсалютна шчаслівага грамадства. Для гэтага ад нараджэння кожнаму чалавеку адводзіцца адна роля, ад якой ён не можа адступіць усё жыццё ні на крок. Аднак, як і ўсе рэалізаваныя ўтопіі, такая мадэль аказваецца нежыццяздольнай. Не ўсе людзі задаволеныя сваім штучным жыццём, многія адчуваюць незразумелую тугу па нявдзейсненых учынках, па занятках, якія не планаваліся для іх камп'ютэрным розумам. Нарэшце, «найлепшая з утопій» заканчваецца паўстаннем. Аўтарам уздымаецца адно з самых галоўных пытанняў усіх антыўтопій: свабода ці шчасце? І увогуле, ці магчымае шчасце без свабоды?

Акрамя вышэй згаданых аўтараў, да жанру антыўтопіі звярталіся такія вядомыя чэшскія фантасты, як **Ё. Нэсвадба, Я. Вейс, І. Кмінэк, Я. Кршэсадла, Ул. Парал** і інш.

Можна сцвярджаць, што традыцыя жанра антыўтопіі ў чэшскай літаратуры мае вельмі доўгую гісторыю, хоць тая не аднойчы перарывалася. Асаблівасць развіцця чэшскай антыўтопіі заключаецца ў тым, што яна, з аднаго боку, абапіралася на ўласную традыцыю (Я. А. Коменскі), а з другога – на дасягненні замежнай фантастычнай літаратуры новага часу.

**Літаратура**

1. *Герчикова Н. А.* Чешская фантастическая проза 70–80-ых гг. XX века: К проблеме новаторства: Автореф. дис. ... .канд. филол. наук. – М., 1987.
2. *Кошик Т. Н., Холодова Т.* К проблеме жанра антиутопии в современной зарубежной литературе // IV Межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых: Сб-к материалов. Брест, 2002.

## ПАРОДЫЯ ЯК СПОСАБ СТВАРЭННЯ НАВАТВОРА

**І. І. Міхно**

Як жанр пародыя сфарміравалася ў Старажытнай Грэцыі (Гіпанакт, Арыстафан). У літаратуры Старажытнай Русі шырока парадзіраваліся царкоўныя службы, пасланні, малітвы («Служба кабаку», «Казанне пра бражніка», «Калязінская чалабітная»). У беларускай літаратуры гэта вядомыя «Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча», «Пасланне Апосталу Пятру» і недаследаваны пакуль польскамоўны твор «Суплікацыя Віленскага збору».

Пародыя старажытнасці адрозніваецца ад пародыі ў сучасным разуменні гэтага паняцця. «Пародыя (грэч.parodia – супрацьспеў, песня навыварат) – жанр сатырычнай літаратуры, заснаваны на карыкатурным перайманні асаблівасцей нейкага твора, творчай манеры аўтара ці